УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# НІКІЦІН ЛЕАНІД АЛЯКСАНДРАВІЧ

МАСТАК ТЭАТРА

1 (14) МАЯ 1896 Г. – 15 КАСТРЫЧНІКА 1942 Г.

# НІКІЦІН АНДРЭЙ ЛЕАНІДАВІЧ

ГІСТОРЫК, АРХЕОЛАГ, ПРАЗАІК, СЫН Л.А. НІКІЦІНА

19 ЖНІЎНЯ 1935 Г. – 15 ЛІСТАПАДА 2005 Г.

**ФОНД № 339**

**ВОПІС № 1**

**1965 – 1988**

МІНСК 2017

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 339**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
| --- | --- | --- | --- |
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ Л.А. НІКІЦІНА | 1-17 | 1-3 |
| 1.1. | ФАТАГРАФІІ НАКІДАЎ І ЭСКІЗАЎ ДЭКАРАЦЫЙ, КАСЦЮМАЎ І МАСАК, СТВОРАНЫХ Л.А. НІКІЦІНЫМ ДЛЯ БЕЛАРУСКАЙ ДРАМСТУДЫІ Ў Г. МАСКВЕ | 1-7 | 1 |
| 1.2. | ДАКУМЕНТЫ ПРА Л.А. НІКІЦІНА | 8-13 | 1-2 |
| 1.3. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 14-17 | 2-3 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ А.Л. НІКІЦІНА | 18-39 | 3-5 |

## Прадмова

**Леанід Аляксандравіч Нікіцін** нарадзіўся 1 (14) мая 1896 года ў г. Разані. У 1915 г. скончыў 2-ю Разанскую мужчынскую гімназію і паступіў на юрыдычны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта, дзе навучаўся да 1918 г. З 1915 г. узаемадзейнічаў з МХТ-1[1], займаўся жывапісам у прыватных студыях г. Масквы (у А.С. Бяссмертнага, А.А. Ленскага, Э.Э. Ліснэра). З 1916 г. да 1917 г. знаходзіўся ў дзеючай арміі. У 1918 г. працаваў мастаком канцэртнага аб'яднання "Сороконожка" (г. Масква). У 1919 г. быў пераведзены на Украіну (г. Харкаў, г. Кіеў, г. Адэса, п-ў Крым) у распараджэнне галоўнага начальніка забеспячэння ўзброеных сіл, потым – скіраваны ў штаб 16-й Арміі Заходняга фронту (г. Смаленск, г. Мінск). У 1920 г. быў адкамандзіраваны для вучобы на японскім аддзяленні Акадэміі Генштаба Чырвонай Арміі (г. Масква), з 1921 г. да 1924 г. працаваў навуковым супрацоўнікам японскага аддзялення Цэнтральнага інстытута жывых усходніх моў. З 1922 г. да 1923 г. чытаў лекцыі па гісторыі мастацтваў у Пралеткульце[2], з 1923 г. да 1924 г. – у Маскоўскім медыка-педагагічным інстытуце. Адначасова займаўся жывапісам ва ВХУТЕМАСе[3] (у А.А. Асмёркіна, А.В. Лентулава, М.У. Сінезубава). Працаваў мастаком-афарміцелем спектакляў у тэатрах г. Масквы: 2-й Цэнтральнай студыі Пралеткульта ("Зори Пролеткульта" В.В. Ігнатава, "Мексиканец" Дж. Лондана, рэж. В.С. Смышляеў, 1921), 1-м Рабочым тэатры Пралеткульта ("Лена" В.Ф. Плятнёва, рэж. В.С. Смышляеў, 1921), ("Принц Хаген" Э. Сінклера, рэж. І.М. Бярсенеў, 1923), 1-й Опернай майстэрні садружнасці артыстаў ("Паяцы" Р. Леанкавалы, рэж. Э.Б. Краснянскі, 1923), ("Женщина из Руана" П. Антакольскага і А. Глобы, рэж. Э.Б. Краснянскі, 1924), Беларускай драматычнай студыі ў г. Маскве ("Власть тьмы" Л.М. Талстога, рэж. В.С. Смышляеў, 1923), ("Царь Максимилиан" А.М. Рэмізава, рэж. В.С. Смышляеў, 1924), ("Пільны вартаўнік" М. Сервантэса, рэж. Б.М. Афонін і А.А. Гейрат, 1925) і інш., МХАТе-3[4] ("Когда проснётся спящий" Ю. Жулаўскага, 1924) (не дазволены), МХАТе-2[5] ("Арэстэя" Эсхіла, рэж. Б.М. Афонін і В.А. Громаў, 1926), 2-ім Маскоўскім тэатры сатыры ("Дом на перекрёстке" М.Я. Трыгера, рэж. Э.Б. Краснянскі, 1927), Дзяржаўным яўрэйскім тэатры Украіны ў г. Адэсе ("Бабеф" М.Ю. Лявідава, рэж. В.С. Смышляеў, 1927), Маскоўскай кансерваторыі ("Алека" С.В. Рахманінава, рэж. А.М. Жылінскі, 1929) і інш. У 1929 г. працаваў старшым навуковым супрацоўнікам Дзяржаўнай акадэміі мастацкіх навук, у 1930 г. –

[1] МХТ-1 (з 1919 г. МХАТ-1) – 1-я студыя Маскоўскага мастацкага (акадэмічнага) тэатра, арганізаваная ў 1912 годзе К.С. Станіслаўскім і Л.А. Суляржыцкім.

[2] Пралеткульт – Пралетарская культурна-асветніцкая арганізацыя пры Наркамаце асветы (1917–1932).

[3] ВХУТЕМАС – Вышэйшыя мастацка-тэхнічныя майстэрні ў г. Маскве (1920–1926).

[4] МХАТ-3 – 3-я студыя Маскоўскага мастацкага (акадэмічнага) тэатра, створаная ў 1913 годзе, у 1926 годзе перайменаваная ў тэатр імя Я.Б. Вахтангава.

[5] У верасні 1924 года МХАТ-1 ператварыўся ў МХАТ-2 на чале з М.А. Чэхавым, у 1936 годзе ў адпаведнасці з распараджэннем СНК СССР і ЦК УКП(б) спыніў сваю дзейнасць.

мастаком-пастаноўшчыкам “Арменкино” ў г. Ерэване. 16 верасня 1930 г. Л.А. Нікіцін быў арыштаваны па справе “Ордэна свету” (“Ордэна тампліераў”) і асуджаны на 5 гадоў папраўча-працоўных лагераў (арт. 58–10). Быў скіраваны на Беламорканал, дзе працаваў мастаком УСЛОНа[6], з 1930 г. да 1934 г. – тэатра СвірЛага ў г. Ладзейным Полі Ленінградскай вобласці і афармляў спектаклі: “Вор” П.А. Арэнскага, рэж. В.М. Грыгор’еў, “Кто виноват?” А.І. Герцэна, рэж. В.М. Грыгор’еў і інш. Вызваліўся 16 ліпеня 1934 года, жыў у г. Калініне (цяпер – г. Цвер). Працаваў мастаком-афарміцелем у Маскоўскім драматычным тэатры: “Скупой” Мальера, рэж. В.С. Смышляеў (1935), “Далёкое” А.М. Афінагенава, рэж. В.С. Смышляеў (1936), 1-м Рабочым тэатры: “Слава” В.М. Гусева, рэж. Э.Б. Краснянскі (1936), “Фома Гордеев” М. Горкага, рэж. Э.Б. Краснянскі (1938), БДТ-2 “Дубровский” А.С. Пушкіна, рэж. П.С. Малчанаў (1937), “Банкир” А.Я. Карнейчука, рэж. В.А. Дарвішаў (1937), Шахцёрскім ансамблі песні і танца (1938), з 1939 г. да 1941 г. – мастаком Навукова-даследчага інстытута цацкі ў г. Загорску (цяпер – г. Сергіеў Пасад). Арыштаваны другі раз 24 чэрвеня 1941 г. і асуджаны на 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў (арт. 58–10).

Л.А. Нікіцін памёр 15 кастрычніка 1942 г. у лагерным лазарэце г. Канска (Краснаярскі край). У 1963 г. ён быў рэабілітаваны па абедзвюх справах.

**Андрэй Леанідавіч Нікіцін** нарадзіўся 19 жніўня 1935 г. у г. Калініне (цяпер – г. Цвер). З 1955 г. да 1960 г. вучыўся на гістарычным факультэце Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М.В. Ламаносава (спецыяльнасць “гісторык і археолаг”), з 1962 г. да 1965 г. – у аспірантуры Інстытута археалогіі АН СССР. З 1957 г. узначальваў археалагічныя атрады, потым – археалагічныя экспедыцыі ў Пераслаўль-Залесскім і Растоўскім раёнах Яраслаўскай вобласці, на Церскім і Летнім берагах Белага мора, удзельнічаў у раскопках у Архангельскай, Мікалаеўскай і Уладзімірскай абласцях, у Закаўказзі, на п-ве Крым, у Малдавіі, г. Ноўгарадзе і г. Пскове. З 1963 г. працаваў журналістам у газетах “Известия”, “Московская правда”, “Неделя”, “Советская культура”, часопісах “Вокруг света”, “Дружба народов”, “Знание – сила”, “Наука и жизнь”, “Новый мир”, “Октябрь”, “Север” і інш. Адначасна друкаваў навуковыя працы па археалогіі, гістарычнаму літаратуразнаўству, гісторыі таемных таварыстваў Расіі і СССР, палеаграфіі, старажытнай і сярэднявечнай гісторыі Усходняй Еўропы, тэксталогіі. З 1975 г. да 1985 г. быў навуковым сакратаром Пастаяннай камісіі па праблемах “Слова о полку Игореве”, з 1976 г. да 1984 г. – старшым рэдактарам аддзела прозы выдавецтва “Советский писатель”. З 1985 г. А.Л. Нікіцін знаходзіўся на творчай працы. Аўтар кніг: “Голубые дороги веков” (1968), “Цветок папоротника” (1972), “Распахнутая земля” (1973), “Возвращение к Северу” (1979), “Дороги веков” (1980), “Над квадратом раскопа” (1982), “Точка зрения” (1985), “День, прожитый дважды” (1985), “Костры на берегах” (1986), “Орден российских тамплиеров”, тт. I-III (2003), “Розенкрейцеры в

[6] УСЛОН – Упраўленне салавецкіх лагераў асобага прызначэння (1920-я – 1930-я гг.).

Советской России” (2004), “Основания русской истории: мифологемы и факты” (2001), “Инок Илларион и начало русского летописания” (2003), “Тайные ордены в Советской России: Тамплиеры и розенкрейцеры” (2006) (надрукавана пасля смерці).

З 1973 г. – член СП СССР, з 1974 г. – Усесаюзнага геаграфічнага таварыства АН СССР.

А.Л. Нікіцін памёр 15 лістапада 2005 г. Пахаваны на Увядзенскіх могілках у г. Маскве.

Дакументы сямейнага архіва Л.А. і А.Л. Нікіціных паступілі ў аддзел фарміравання НАФ БДАМЛМ у 1986 г. і 1997 г. ад Андрэя Леанідавіча Нікіціна. У 1989 г. і 1997 г. яны прайшлі экспертызу гістарычнай і навуковай каштоўнасці і ў адпаведнасці з рашэннем ЭМК БДАМЛМ (пратаколы № 14 ад 30.11.1989 г. і № 7 ад 27.05.1997 г.) былі прыняты на пастаяннае захоўванне. У 2017 г. дакументы сямейнага архіва Л.А. і А.Л. Нікіціных прайшлі навуковае апісанне. Быў складзены вопіс № 1 у колькасці 39 спраў (66 дакументаў) за 1965–1988 гг., копіі дакументаў за 1924–1926 гг.

Вопіс складаецца з 2-х раздзелаў.

1. У раздзеле “Дакументы Л.А. Нікіціна” – 3 падраздзелы, справы ў якіх сістэматызаваны па жанрах і храналогіі за 1976–1986 гг. У першым падраздзеле змешчаны копіі фатаграфій накідаў і эскізаў дэкарацый, касцюмаў і масак Л.А. Нікіціна да спектакляў Беларускай драматычнай студыі ў г. Маскве і інш. Другі падраздзел прадстаўлены артыкуламі пра Л.А. Нікіціна, рэцэнзіяй і нататкай з яго ўпамінаннем, успамінамі В.Р. Нікіцінай аб ім. У трэцім падраздзеле знаходзяцца фатаграфіі Л.А. Нікіціна, індывідуальная і ў групе з акцёрамі Беларускай драматычнай студыі ў г. Маскве, і інш.

2. У раздзеле “Дакументы А.Л. Нікіціна” знаходзяцца яго рукапісы: аповесці, апавяданне, нарысы і артыкулы за 1965–[1985] гг.; аўтабіяграфія А.Л. Нікіціна і спіс яго надрукаваных работ.

За раздзелам змешчаны фатаграфіі А.Л. Нікіціна, індывідуальныя (1979–1983) і групавая (1978).

Прадмову склала
вяд. архівіст В.Ф. Шаталава
31.08.2017

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

_____________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ Л.А. НІКІЦІНА** | | | | |
| | **1.1. ФАТАГРАФІІ НАКІДАЎ І ЭСКІЗАЎ ДЭКАРАЦЫЙ, КАСЦЮМАЎ І МАСАК, СТВОРАНЫХ Л.А. НІКІЦІНЫМ ДЛЯ БЕЛАРУСКАЙ ДРАМСТУДЫІ Ў Г. МАСКВЕ** | | | | |
| 1 | "Апраметная". Накіды і эскізы касцюмаў да спектакля паводле п'есы В.А. Шашалевіча (1925). Фотакопіі | [сяр. 1980-х гг.] | 11 | 11 | |
| 2 | "Сон у летнюю ноч". Накіды касцюма і масак да спектакля паводле п'есы У. Шэкспіра (1925). Фотакопіі | [сяр. 1980-х гг.] | 3 | 3 | |
| 3 | ["Чорт і баба"]. Эскіз касцюма да спектакля паводле п'есы Ф. Аляхновіча (1925). Фотакопія | [сяр. 1980-х гг.] | 1 | 1 | |
| 4 | "Эрас і Псіхея". Эскіз касцюма да спектакля паводле п'есы Ю. Жулаўскага (1926). Фотакопія | [сяр. 1980-х гг.] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 5 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Царь Максимилиан" паводле п'есы А.М. Рэмізава (рэж. В.С. Смышляеў, мастак Л.А. Нікіцін) (1924). Копія | [сяр. 1980-х гг.] | 1 | 1 | |
| 6 | Фатаграфіі сцэн з спектакля "Сон у летнюю ноч" паводле п'есы У. Шэкспіра (рэж. В.С. Смышляеў, мастак Л.А. Нікіцін) (1925). Копіі | [сяр. 1980-х гг.] | 5 | 5 | |
| | * * * | | | | |
| 7 | Праграма спектакля Беларускай драмстудыі ў г. Маскве "Сон у летнюю ноч" паводле п'есы У. Шэкспіра (рэж. В.С. Смышляеў, мастак Л.А. Нікіцін) [1925]. Фотакопія | [сяр. 1980-х гг.] | 1 | 1 | |
| | **1.2. ДАКУМЕНТЫ ПРА Л.А. НІКІЦІНА** | | | | |
| 8 | А.Л. Нікіцін. "Материалы к биографии театрального | [1985] | 22 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | художника Л.А. Никитина".<br>Машынапіс | | | | |
| 9 | А.Л. Нікіцін. "Из дали прошлых лет" = "Минский поиск", "Крок да тэатра будучыні" і інш. Артыкулы пра Л.А. Нікіціна.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай, выразка з часопіса | 1986 | 37 | 3 | |
| 10 | Х. Херсонскі. "Царь Максимилиан". Рэцэнзія на аднайменны спектакль Беларускай драмстудыі ў г. Маскве па п'есе А.М. Рэмізава (рэж. В.С. Смышляеў) з упамінаннем Л.А. Нікіціна і яго малюнкам.<br>Фотакопія ўрыўка з газеты "Известия" (17.12.1924 г.) | [сяр. 1980-х гг.] | 1 | 1 | |
| 11 | Г. Алекнавічус. "З альбома". Нататка пра оперу "Алека" Маскоўскай кансерваторыі (рэж. А.М. Жылінскі) (1929) з фатаграфіяй Л.А. Нікіціна з акцёрамі і з упамінаннем аб ім.<br>На літоўскай мове.<br>Выразка з часопіса "Svyturys" ("Маяк"), № 9, 1987 | | 1 | 1 | |
| 12 | В.Р. Нікіціна. "Воспоминание о Леониде Александровиче Никитине".<br>Машынапіс у пераплёце з сямейнымі фатаграфіямі | [1986] | 304 | 1/38 | |
| | * * * | | | | |
| 13 | В.Р. Нікіціна. "Сергей Михайлович Эйзенштейн (пропущенные страницы воспоминаний)".<br>Машынапіс з карэктурай А.Л. Нікіціна | 1976 | 6 | 1 | |
| | **1.3. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 14 | Фатаграфія Л.А. Нікіціна (1926) з дароўным надпісам С.М. Станюце. Копія | [сяр. 1980-х гг.] | 1 | 1 | |
| 15 | Фатаграфія Л.А. Нікіціна ў групе з акцёрамі Беларускай драмстудыі ў г. Маскве: Б.М. Афоніным, Р.М. Кашэльнікавай, П.П. Пашковым і інш. пасля спектакля "Царь Максимилиан" А.М. Рэмізава (рэж. В.С. Смышляеў, мастак Л.А. Нікіцін) (1924).<br>Копія | [сяр. 1980-х гг.] | 1 | 1 | |
| 16 | Фатаграфіі Л.А. Нікіціна ў групе з акцёрамі Беларускай драмстудыі ў г. Маскве: Т.А. Бандарчык, Я.Г. Глебаўскай, А.П. Радзялоўскай, К.М. Саннікавым, С.М. Станютай, Ц.М. Сяргейчыкам і інш. у час адпачынку на р. Лучосе ў | [сяр. 1980-х гг.] | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Віцебскай вобласці (1926). Копіі | | | | |
| | * * * | | | | |
| 17 | Фатаграфіі акцёраў Беларускай драмстудыі ў г. Маскве і МХАТА-2 : Б.М. Афоніна, Т.А. Бандарчык, А.А. Гейрата, Я.К. Глебаўскай, А.К. Ільінскага, С.М. Станюты, Ц.М. Сяргейчыка і інш., індывідуальныя і ў групах, за 1925-1926 гг. Копіі | [сяр. 1980-х гг.] | 4 | 4 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ А.Л. НІКІЦІНА** | | | | |
| 18 | "Меж север побережник". Аповесць. Аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай праўкай | 1966 | 52 | 1 | |
| 19 | "Дороги веков". Зборнік аповесцей. Пачатак. Гранкі з аўтарскай і карэктарскай праўкай | 1980 | 124 | 1 | |
| 20 | "Дороги веков". Зборнік аповесцей. Заканчэнне. Гранкі з аўтарскай і карэктарскай праўкай | 1980 | 138 | - | |
| 21 | "Над квадратом раскопа" = "Формула постижения". Дакументальная аповесць. Пачатак. Машынапіс з аўтарскай праўкай і ўклейкай | 1982 | 154 | 1 | |
| 22 | "Над квадратом раскопа" = "Формула постижения". Дакументальная аповесць. Працяг. Машынапіс з аўтарскай праўкай і ўклейкай | 1982 | 147 | - | |
| 23 | "Над квадратом раскопа" = "Формула постижения". Дакументальная аповесць. Заканчэнне. Машынапіс з аўтарскай праўкай і ўклейкай | 1982 | 132 | - | |
| 24 | "Тайна двух Биармий" = "По следам саги". Дакументальная аповесць. Машынапіс са значнай аўтарскай праўкай і ўклейкай | 1983 | 125 | 1 | |
| 25 | "Зелёный Тарханкут" = "Ни эллину, ни варвару...". Дакументальная аповесць. Машынапіс са значнай аўтарскай праўкай і ўклейкай | 1984 | 49 | 1 | |
| 26 | "Беломорский лабиринт" = "Тропою древних саамов". Дакументальная аповесць. Машынапіс са значнай аўтарскай праўкай | 1985 | 131 | 1 | |
| 27 | "Мурманский гамбит" = "Презумпция невиновности". Дакументальная аповесць. Пачатак. Машынапіс з аўтарскай праўкай і ўклейкай | [сяр. 1980-х гг.] | 103 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 28 | "Мурманский гамбит" = "Презумпция невиновности". Дакументальная аповесць. Заканчэнне.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай | [сяр. 1980-х гг.] | 85 | - | |
| | * * * | | | | |
| 29 | "Пусть придёт собачник". Апавяданне.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1968 | 21 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 30 | "Комони ржуть за Сулою - звенить слава в Кыеве...". Гістарычны нарыс. Варыянты. Няпоўны тэкст.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1982 | 82 | 2 | |
| 31 | "День завтрашний и день вчерашний" = "Хрупкая связь времён". Нарыс, прысвечаны праблеме захавання гістарычных помнікаў і прыроднай спадчыны Расіі.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай і ўклейкай | 1983 | 103 | 1 | |
| 32 | "Человек без лица". Гістарычны нарыс пра вялікага князя Васіля III і цара Іаана IV (зборнік "Писатель и время").<br>Гранкі з аўтарскай і карэктарскай праўкай і ўклейкай | 1983 | 38 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 33 | Артыкулы па археалогіі і інш.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай, машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | 1965-1978 | 45 | 4 | |
| 34 | "Термин "дьскы" в "Слове о полку Игоревым" = "Значение термина "дьскы" в "Слове о полку Игоревым" і інш. Артыкулы.<br>Аўтарызаваны машынапіс са значнай аўтарскай праўкай, машынапіс са значнай аўтарскай праўкай | 1976, 1978 | 27 | 2 | |
| 35 | "Первый спектакль С.М. Эйзенштейна в Пролеткульте". Артыкул.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай і ўклейкай | [1985] | 71 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 36 | Аўтабіяграфія.<br>Машынапіс.<br>Візітка А.Л. Нікіціна | [1986, 1990-я гг.] | 3 | 2 | |
| | * * * | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 37 | Спіс надрукаваных прац А.Л. Нікіціна. Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1988 | 12 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 38 | Фатаграфіі А.Л. Нікіціна, індывідуальныя | 1979-1983 | 5 | 5 | |
| 39 | Фатаграфія А.Л. Нікіціна ў групе з А.Я. Маркавым, С.І. Шуртаковым і інш. у час Дзён літаратуры ў г. Каломне | 1978 | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 39 (трыццаць дзевяць)

спраў з № 1 па № 39 , 67 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

вяд. архівіст В.Ф. Шаталава

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.